ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ
ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА І МЕНСКАГА КОМІТЭТАЎ ЛЕНІНСКАГА КОМУНІСТЫЧНАГА САЮЗУ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

№ 54 (436) Серада, 18 мая 1927 г. || Выходзіць тры разы на тыдню у СЕРАДУ, ПЯТНІЦУ І НЯДЗЕЛЮ || Год выд. VII. || Рэдактар прымае ад 12 да 2 гадз. дню. Сакратар ад 10—12 і ад 2—3 гадз. Тэл. № 903. || Адрас рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена": Менск, Комсам. 25.

На шляхох да навукі.

Адчыняецца новы **прыём у вышэйшыя, сярэднія і ніжэйшыя** профэсыйныя навучальныя ўстановы. Перад моладзьдзю ставіцца пытаньне аб выбары адпаведнай навучальнай установы ці факультэту.

Вядома, самым ідэёвым парадкам падбору моладзі для тых ці іншых спэцыяльнасьцяй быў-бы навуковы падбор, вывучэньне ўхілаў, талянтаў асаблівасьцяў складу кожнага чалавека. Але да гэтага яшчэ далёка. Зараз кожны будзе кіравацца сваім асабістым ухілам, кожнаму маладому чалавеку малюецца яшчэ раней пажаданае для яго будучае. Адсюль выцякае шмат чаго. **Трэба прыняць пад увагу ня толькі свае намераньні і пажаданьні аднosна будучага, але і свае здольнасьці.** Ня шкодна было-б азнаеміцца з тым, хто цяпер больш усяго патрэбен нашай **Савецкай дзяржаве і будуючамуся комунізму.**

Цяпер да ведаў трэба аформіць, надаць ёй характар сьвядомага і ўпартага імкненьня да вызначанай профэсыі. Тут таксама патрэбна мэтавая ўстаноўка. **Паміж іншым рабочая і сялянская моладзь** у сваёй значнай частцы знаходзіцца покуль што «на **раздарожжы**», кідаецца з боку ў бок, ня ведае цьвёрда, у якой навуковай галіне яна павінна набываць веды, чаму і як яна павінна вучыцца для таго, каб атрымаць у будучым тую ці іншую кваліфікацыю.

Трэба загадзя на падставе выявіўшыхся здольнасьцяй, запатрабаваньняў і ранейшай самаадукацыйнай ці школьнай падрыхтоўкі вызначыць, у якую навучальную ўстанову належыць паступіць і якія даныя для гэтага неабходна мець.

У гэтым напрамку мы маем досыць павучыцельныя вурокі. Здараецца так, **што паступае які-небудзь рабфакавец**, скажам, на Праўгае БДУ, горача бярэцца за вучобу на першых парах, упарта грызе маладымі зубамі «граніт навукі»... Другі прыклад: калі паступіў адзін хлапец у профшколу будаўнікоў, правучыўся цэлы год, а бываюць выпадкі, калі на мэдфаку БДУ правучваюцца па 4 гады. Але праз некаторы час выяўляецца, што праграма заняткаў не адпавядае яго ведам, здольнасьцям і імкненьням, каханьне да справы прападае, да вучобы пачынае адносіцца няўважліва, думкі працуюць яго ў другім напрамку.

Чым-жа гэта тлумачыцца? Вядома, гэта сьведчыць аб тым, што **яны паступалі, кіруючыся ня цьвёрда абдуманым рашэньнем**, а прытрымліваючыся старой пагаворцы «а вось да нябось»...

Трэба падкрэсьліць, што **асаблівая адказнасьць за вынасімыя рашэньні павінна падаць на тых комсамольцаў, якія паступаюць у тэхнічныя ВНУ**, вучацца на інжынэра, агронома, доктара і г. д. **Пры паступленьні трэба ўзважыць усё за і супроць, мець перад сабой усе гарантыі за тое, што абіраемая навучальная ўстанова будзе скончана.**

Дзяржаве вельмі пажадана, каб у Пэдагогічныя Навучальныя ўстановы паступала больш рабочых і бяднейшых сялян. У сувязі з задачай увядзеньня ўсеагульнага абавязковага навучаньня нам патрабуюцца тысячы новых настаўнікаў.

Кожнаму паступаючаму трэба ведаць, да чаго імкнецца, якія цяжкасьці прыдзецца перамагчы і быць цьвёрда ўпэўненым у сваіх сілах.

Трэба памятаць, якія абавязкі прымае на сябе студэнцтва перад дзяржавай у справе падрыхтоўкі чырвоных спэцыялістых, будаўнікоў для гаспадаркі і культуры.

Для таго, каб пераступіць парог абіраемай установы, патрабуецца грунтоўнае знаемства з прадмэтамі і прыці на іспыты досыць стала падрыхтаванымі.

У гэтым годзе праводзіцца новы чарговы набор у ВНУ, рабфакі, тэхнікумы і профшколы. Якасны падбор павінен быць больш уважлівы, чым у мінулым годзе. **Навучальныя ўстановы прымуць у свае сьцены толькі тых, хто сапраўды хоча і можа вучыцца. Гэта павінен памятаць і добра прадумаць кожны малады рабочы і селянін.**



НАШ ПАРАВОЗ ЛЯЦІЦЬ НАПЕРАД...

Усебеларуская экскурсія моладзі у дарозе

(Ад паходнай рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена")

Крануліся...

(Эскіз).

Зьвечарэла.

Насупіўся Менск у завулках, асьвяціўся яскрава дзяўным сьветам у вітрынах.

Месяц дрыжаў у муці разбаўленых парваных хмар; халаднавата...

На Комсамольскай шум і гам. Цэлай чарадою экскурсантаў запрудзіліся вароты ў «Чырвоную Зьмену»... Цякуць гаворкі, усе аб адным, аб вялікай і цікавай паездцы...

Не прабіцца. Відаць, што кожнага ад'яжджаючага прышлі праводзіць яго знаёмыя... У дзьвярох рэдакцыі піхамірна стаіць група чырвонаармейцаў-музыкантаў. Чакаюць, калі «прыкажуць»...

З артыстычным захапленьнем, з радасьцю, з мягкім гумарам атакованы з усіх бакоў экскурсантамі—старшыня экскурскамісіі і выдае пасьведчаньні. У залі жарты і сьмех. Шукаюць сярод натаўпу знаёмых, а знайшоўшы іх сьмяюцца, перакідваюцца неабходнымі думкамі.

Ну, як будзе з тваім залікам?—пытае адна высокая паўнагрудая дзяўчына у пэнснэ ў другой выяжджаючай.

Здамо! Але ўяві сабе, Любачка, што гэта за радасьць, за шчасьце праехаць Ленінград, Кранштат, Волхаўбуд!

— Шчасьлівая ты!

І так навокала,

Але!!!

— Рабяты, пагружай свае рэчы на грузавік!

Загулі, затопалі, загрукалі чамаданчыкамі, сундучкамі, загарэліся трывожна радасна вочы, яскравей шавяльнулася у кожнага ў грудзёх пачуцьцё.

Не пакінуць і мяне... Еду!

А на вуліцы к экскурсантам падышоў яшчэ і атрад піонэраў, галасамі юнацкімі, задорнымі вылы[ў] з цемені.

— Няхай жывуць экскурсанты!

— Ура! Ур-р-р-а-а-а-а!—мякка паплыло над горадам.

Музыканты маршам грымнулі, з завулкаў народу падбавілася, гэтым часам хлопцы, выстроіўшыся ў шарэнгі, пад музыку задрукавалі па бруку...

Дрыжэла ноч ціхімі ўсьплёскамі, ласкава ўсьміхаўся месяц, нарваваліся полымям факелы ў руках піонэраў.

А разам з гэтым песьні, сьмех, вясельле: відаць, рады былі хлопцы, што вырваліся ў такую вялікую, але надзвычайна цікавую дарогу.

У вагоне змрочна... Навокала нясьціхаючая гамонка, стуканьне... Гэта хлопцы «прымяняюцца к меснасьці».

А потым песьні, і песьні, і песьні.

А гэтым часам у дальнім купэ, штаб экскурсіі, пад самаю стольлю, на полках робіць свае паседжаньне... У выніку:

— Хлопцы, у вагоне ня курыць.

— Добра!...

. . . .

Там-сям ужо задалі некаторыя храпака, расьцягнуўшыся на верхніх паліцах, а ўнізу ціха мурлыкалі песьні, ды яшчэ цішэй гаварылі аб заўтрашнім дню.

М. Нікановіч.

У Барысаве

12-га мая райком ЛКСМБ н.-Барысаву ў рабочым клюбе наладзіў вечар праводаў экскурсантаў.

Заля была запоўнена біткам. Былі і старыя рабочыя.

Пасьля прачытаньня сьпісу ад'яжджаючых, на тварах прысутных праносілася нешта такое, што зычыла экскурсантам добрага посьпеху ў праводзеньні экскурсыі.

Пасьля 3-х гадзіннага працягу вечару было абвешчана, што надыходзіць час прыходу цягніка.

Усе экскурсанты са сваімі «манаткамі» організавана з духовым оркестрам, гуртам моладзі і старыкоў накіраваліся на вакзал.

Ня гледзячы на позьні час сотні чалавек былі на вакзале. Быў даны першы званок і доўга чаканы цягнік спыніўся.

Экскурсант.

Пасьля доўгіх „мытарств".

Ведаючы, што «Чырвоная Зьмена» рыхтуе масавую экскурсыю і жадаючы паехаць, я пашоў да адміністрацыі атрымаць водпуск. Але ня так то лёгка было дагаварыцца з ёю. Адміністрацыя наадрэз адмовіла кажучы, што мяне няма кім замяніць у сувязі з адпускной кампаніяй.

Калі нельга, дык нельга, і думку аб паездцы я з вялікім жалем пакінуў.

На пярэдадні ад'езду экскурсіі сустракаю я старшыню экскурсыйнай камісіі: «Ну, што, як з табою?.. Заўтра мы едзем»...

Ад жалю ў мяне сэрца сьціснулася... Я яму раскажаў усю гісторыю, чаму я не магу ехаць. Тут-то ўсё і паправілася. Пашоў ён са мною да адміністратара. З вялікай цяжкасьцю, але удалося ўрэгуляваць гэтае пытаньне і я паехаў.

У дзьве гадзіны ночы у Барысаве сустракаем групу нашых экскурсантаў. Выходзім на плятформу... Некалькі зноў прывітаньня і зноў едзем далей.

Гольдман.

У вагоне.

Пад мерны стук калёс, прыглушаны гукамі аркестру і доўга незмаўкаючымі крыкамі «ура» праводзячых, ад'яжджаем ад станцыі.

Мы едзем. Рэчы ўсе разабраны, і староста «прыстройвае» цябе на адзін з трох паверхаў. Лёзунг у «**цясната, да ня ўкрыўдзе**», але ўсё-ж некаторым хлопцам прыходзіцца падзяжурыць, каб праз пару гадзін соладка надзасную, на месцы свайго таварыша.

Нельга было не ўсьміхнуцца гледзячы на вясёлыя з шчасьлівым выразам твары організатараў экскурсіі. Яны былі рады, была рада ўся камісія і з ёю уся экскурсія. Гэтая радасьць зьявілася ня толькі таму што паездка ўдалася, а таму, што у дарозе стварыўся бясконца бадзёры моцны коллектыў.

Плян-жа дзяжурстваў ня ўдаўся.

Прычына была тая, што нікому не хацелася спаць. Хлопцы ўвесь час пелі песьні, пад акомпанімэнт сталовых ложак.

Мы запэўнены у посьпеху нашай экскурсіі таму, што наш моцны коллектыў з гэтаю працаю справіцца.

Олікер.

„Параход ідзе—вада кольцамі"...

* * *

Так у песьні пяецца...

А тут не параход, а цягнік, вагон 3030; гэта кожны экскурсант памятуе, бо яны ў ім зьмяшчаюцца.

Гудзіць-гудзіць цягнік...

Некаторыя з экскурсантаў залезьлі наверх, на полкі ды «даюць храпака», другія вядуць гаворкі на самыя розна-стойныя тэмы...

А пятай гадзіне раніцы цягнік крахціць, стукаюць калёсы і застанаўліваецца...

Станцыя Віцебск, шумнай гурбой выходзяць на вялікі вакзал, на чарзе здаюць ў багаж чамаданы і вянзелькі.

Все нечым новым, бо ня так далёка да Ленінграду.

Ізноў вясёлая гаворка і сьмех.

Горад Віцебск.

У Віцебску цягнік будзе стаяць да 6 гадзін вечара, застаецца шмат часу, яго патрэбна скарыстаць...

Наш «важак» тав. **Курцік**—з чырвонай павязкай на левай руцэ, высокі, сажавіты, упэўнены ў сваёй справе, направіў на патыліцу шапку, гаворыць вычна, аб тым, каб пайці агледзіць гурбою горад. З боку радасьць...

І грудам ідзем ад вакзалу на вуліцы. Мільгаюць шыльды, праходзяць новыя незнаёмыя людзі...

От яна шырокая, з адлеглымі берагамі, Дзьвіна; яе перасякае каменны мост. Дзьвіна падзяляе на дзьве часткі горад. Па халаднаватай вадзе плавае па некалькі чаўноў, ля берагоў стаяць дзеравяныя плыты...

Тав. Касьпаровіч былы працаўнік па краязнаўству на Віцебшчыне; добра ведае сучасны і гістарычны Віцебск. Вядзе размову:

— От такая белая царква на горцы, пачала будавацца яшчэ у 12 стагодзьдзі італьянскім архітэктарам...

Цяпер царква ўжо старая, аблезлая, але цікаў яе заходне-эўропэйскі стыль, цікава тым, што перажыла столькі падзей, столькі барацьбы за рэлігію, бачыла забойствы князёў, бунты сялянства і г. д. Наогул-жа, Віцебск багаты царквамі...

Экскурсанты ўважліва слухаюць. Прахожыя не праміпаюць застанавіцца, ня ведаючы ў чым справа. Вось у самую гушчу ўмяшалася старэнькая бабулька ў рабай спадніцы і з кошыкамі ў руках. Барадаты дзядуля у сярмязе—беларус, чэша патыліцу і дзівіцца, мусіць:

— Чаго гэта яны сабраліся на мосьце такой гурбою?..

Ідзем далей...

Заварачваем з галоўнай вуліцы ўлева, узыходзім на крупную горку, слухаем цэлы даклад аб гісторыі ды старажытнасьці Віцебску. А горад, як на далоні: блішчаць жалезныя дахі двух і трохпавярховых дамоў, бялеюцца купалы цэркваў... У горадзе стукат трамваю, галасоў, а ўнізе мутна-серабрыстая Дзьвіна пералівае хвалі ў ялзусім пагодны дзень...

Музэй.

Вялізны будынак, падобны на царкву. Пры ўваходзе на другі паверх, сядзіць фігура старадаўняга ваякі, убранага ў жалезы, кальчугу. Так ваявалі ў даўнюю пару... На сьценах разьвешаны самыя разнастойныя зброі, пачынаючы ад незапомных часоў і да сучаснасьці. Цікавы портрат старога, барадатага эфрэйтора—вэрвара ваякі...

Вядзе гаворку аб усім нейкі служачы у акулярах. Ён, мусіць, вельмі любіць гэтую справу,-таму, што дасканальна аб усім ведае, гаворыць з такім натхненьнем...

Аддзел **нумізматыкі** (калекцыі грошаў). Вельмі многа іх, розных формаў, розных стагодзяў, выкапаныя з зямлі, як дарагая знаходка.

Беларуская крашаніна, паясы, вышываньне па палатне—вельмі маруднае, высока-мастацкае. (Гэта з тых часоў, яшчэ, калі паны забіралі к сабе ў пакоі вясковых дзяўчат і тыя здольна заздаблялі іх прыхаці). У адным з пакояў ляжаць «мошчы» сьв. Апрасіньні полацкай, к якой цэлымі натоўпамі прыходзілі багамольцы. Перад сабою бачым проста згніўшы шкілет і нават не жаночы, а мужчынскі.

Малюнкаў гістарычных у музэі мала...

Усе здаволены, бо некаторыя з экскурсантаў далей сваёй вёскі ці горада нідзе ня былі, нічога ня бачылі.

Ідзём у

Вэтэрынарна-зоолёгічны музэй.

Тут паказана жыцьцё і хваробы розных жывел. І прагледзіць гэты аддзел уважліва было-б вельмі карысна.

Пагляд[з]ець, напр., такіх выпадкаў з жывёлы, як цялёнак з васьмі нагамі, адной галавою і дзьвума хвастамі, якія зьберагаюцца пад шклом, ці парасё з двума галавамі і г. д.

Але, няма часу, доўга быць ня прыходзіцца...

* * *

Ёсьць свой фотограф.

Зрабілі агульны здымак экскурсантаў..

Ю. Навал ь.

Новая правакацыя Ангельскага ўраду.

Напад на Савецкае Гандлёвае прадстаўніцтва ў Лёндане

Вобыск паліцыі ў Аркосе.

У чацьвер 12 мая пасьля паўдня Ангельская паліцыя ўчыніла наскок на памяшканьне Аркоса у «Саветхаўз»—Савецкі дом.

На запытаньне карэспандэнта ТАСС аб прычынах вобыску, адказ паліцыя адмовілася даваць.

Гандлёвае прадстаўніцтва спыніла працу.

Аркос і гандлёвае прадстаўніцтва ўхвалілі часова спыніць працу. Гандлёвыя опэрацыі спынены да таго часу, пакуль паліцыя ні пакіне савецкага дому.

Протэст паверанняга ў справах СССР у Ангельшчыне т. Розэнгольца.

Пасьля наскоку Ангельскай паліцыі на Савецкае Гандлёвае Прадстаўніцтва ў Лёндане, паверанны ў справах СССР наведаў міністэрства замежных спраў, дзе меў гутарку з Чэмбэрленам на працягу паўгадзіны і заявіў фармальны протэст супроць наскоку.

Голас пролетарыяту

Друк паведамляе, што ва ўсіх гарадох Савецкага Саюзу адбыліся вялікія мітынгі протэсту супроць правакацыі Ангельскага ўраду.

Рабочыя патрабавалі ад Савецкага ўраду, рашучых мер да абароны пролетарскіх прадстаўнікоў у імпэрыялістычных краінах.

Пролетарыят абяцаў што, пры першых спробах Ангельскага капіталу напасьці на наш Саюз мы зможам узяць вінтоўку і стаць на абарону Савецкага Саюзу.

Прэч рукі ад СССР.

Рабочыя ўсіх краін павінны падняць голас протэсту супроць новай правакацыі імпэрыялістаў, накіраванай да зрыву міру.



Сабак спусьцілі з ланцужка

Калі хочаш вучыцца--ведай правілы прыёму.

Рабоча-сялянская моладзь павінна прыці ў школы падрыхтаванай.

Куды можна паступіць вучыцца?

Асноўныя палажэньні прыёму ў Вышэйшыя Навучальныя Ўстановы ў 1927 годзе зьяўляюцца паглыбленьнем вопыту мінулага году і паляпшэньня якаснага экладу г. зн. па соцыяльнаму становішчу і на падрыхтоўцы паступаючага.

У 1927-28 навучальным годзе прыём адбудзецца ува ўсе Вышэйшыя Навучальныя Ўстановы, рабфакі (апрача Аршанскага), тэхнікумы, профшколы усіх тыпаў і пэдагогічныя курсы БССР.

Раней чым падаць заяву, падумай і выбяры у якую навучальную установу ты зьбіраешся паступаць.

Вышэйшыя Навучальныя Ўстановы БССР.

1. **Беларускі Дзяржаўны Ўнівэрсытэт** (знаходзіцца ў Менску. Мае факультэты: Пэдагогічны, Мэдычны і Факультэт Права і Гаспадаркі).

2. **Беларуская Дзяржаўная Акадэмія Сельскай Гаспадаркі** (знаходзіцца ў г. Горкі, Аршанскай акрузі). (Мае факультэты: Аграномічны, Землябудаўнічы, Лясны і Мэліорацыйны).

3. **Беларускі Дзяржаўны Вэтэрынарны Інстытут** (знаходзіцца ў Віцебску).

4. **Вышэйшыя курсы беларусазнаўства** (знаходзяцца ў Менску. Прымаюцца толькі настаўнікі па камандыроўкам Акрана.)

Рабочыя факультэты.

Рабфак пры Беларускім Дзяржаўным Унівэрсытэце (Менск), **рабфак пры Акадэміі** (Горкі, Аршанскай акрузі), рабфак (г. Орша) (прыёму няма), вячэрні рабфак пры Вэтэрынарным Інстытуце (Віцебск).

Пэдагогічныя тэхнікумы.

Беларускі Пэдтэхнікум (Менск), **Польскі Пэдтэхнікум** (Менск), **Яўрэйскі Пэдтэхнікум** (Менск), **Беларускі Пэдтэхнікум** (Віцебск), **Яўрэйскі Пэдтэхнікум** (Віцебск), **Беларускі Пэдтэхнікум** (Рагачоў), **Беларускі Пэдтэхнікум** (Барысаў), **Беларускі Пэдтэхнікум** (Полацк), **Беларускі Пэдтэхнікум** (Магілеў), **Белпедтэхнікум** (Мсьціслаў), **Белпэдтэхнікум** (Мазыр), **Беларускі Пэдтэхнікум** (Ворша), **Беларускі Агра-Пэдтэхнікум** (Чырвоны Бераг, Бабруйскай акругі), **Беларускі Пэдтэхнікум** (Гомель), **Яўрэйскі Пэдтэхнікум** (Гомель).

Прамыслова-экономічныя тэхнікумы.

Коопэратыўны тэхнікум (Віцебск).

Мэдыцынскія тэхнікумы.

Акушорскі тэхнікум (Магілеў), фармацэўтычны тэхнікум (Магілеў).

Індустрыяльныя тэхнікумы:

Архітэктурна-Дарожна-Будаўнічы Тэхнікум (Менск)., **Вячэрні Рабочы Тэхнікум пры Арх.-Дар.-Буд. Т-ме** (Менск), **Электромэханічны Тэхнікум** (Віцебск).

Сельска-Гаспадарчыя Тэхнікумы.

Гідратэхнікум (Менск), Варонецкі Тэхнікум з ухілам жывёлаводзтва і малочнай гаспадаркі (Барысаў), Садова-Гародніцкі Тэхнікум (Марына-Горка, Менскай акругі), Каморніцка-Землеўпарадкаваны Тэхнікум (Магілеў).

Мастацка-Музычныя Тэхнікумы.

Беларускі Дзяржаўны Музычны Тэхнікум (Менск), Беларускі Дзяржаўны Мастацкі Тэхнікум (Віцебск).

Пэдагогічныя курсы.

Двохгадовыя Беларускія Настаўніцкія Курсы знаходзяцца ў гарадох: Менск, Магілеў, Віцебск, Рагачоў, Мсьціслаў. Двохгадовыя Яўрэйскія Настаўніцкія Курсы (Менск), Двохгадовыя Польскія Наст. Курсы (Менск).

Профтэхнічныя школы.

Аб'яднаныя Профшколы знаходзяцца ў гарадох: Менск, Слуцк, Клімавічы, Крычаў, Калінінскай акругі, Ворша. Профшколы Мэталістаў знаходзяцца ў гарадох: Бабруйск, Магілеў, Віцебск, Чаўсы, Магілеўскай акругі, Гарадок Віцебскай акругі. Профшколы Будаўнікоў знаходзяцца ў гарадох: Менск, Магілеў, Віцебск. Профшкола абуўнікаў (Магілеў), Профшкола Дрэваапрацовачнікаў (Мазыр), Профшкола Ткацтва (Старое Сяло, Віцебскай акругі), Профшкола Краўцоў (Менск), Профшкола Мэталістаў (Гомель), Профшкола Дрэваапрацовачнікаў (Гомель).

Сельска-гаспадарчыя профшколы.

Сельска-гаспадарчая школа жывёлагадоўлі (м. Смаляны, Аршанскай акругі), Сельска-гаспадарчая школа паляводзтва (м. Капічы, Калінінскай акр.), Сельска-Гаспадарчая школа сыраварні і жывёлагадоўлі (м. Беліца, Віцебскай акругі), Школа рыбаводзтва (м. Жыткавічы, Мазырскай акругі), Лесатэхнічная школа (с. Жорнаўка, Бабруйскай акругі), Лясная профшкола (для перападрыхтоўкі ляснога тэхнічнага пэрсоналю—аднагадовы курс навучаньня. —Буда-Кашалёва, Бабруйскай акругі), Сельска-гаспадарчая школа (с. Рэчкі, Гомельскай акругі).

Што патрабуецца ад паступаючага.

Па якіх дысцыплінах павінен быць падрыхтаваны паступаючы.

Паступаючыя ў ВНУ падлягаюць прыймовым іспытам па 5-ці прадмэтам: расійскай мове, беларускай мове, матэматыцы, фізыцы і грамадазнаўству. Рабфакаўцы, як і ў мінулым годзе, трымаюць іспыты ня пры ВНУ, а пры рабфаках у камісіях з удзелам прадстаўнікоў ВНУ.

Клясавы прынцып прыёму.

Залічэньне вытрымаўшых іспыты ў ВНУ будзе адбывацца на аснове клясавага прынцыпу. Перавагу перад іншымі соцыяльнымі групамі маюць рабочыя і сяляне і іх дзеці, дзеці навуковых працаўнікоў і спэцыялістых, працуючых у дзяржаўных установах і прадпрыемствах згодна пастановы Саўнаркому.

Для правядзеньня прыёму ў ВНУ ў 1927-28 нав. годзе пры кожнай ВНУ організуецца прыймовая камісія, якая працуе на падставе асобнага палажэньня.

У лік студэнтаў ВНУ прымаюцца асобы не маладзей 17 год.

Якія патрэбны дакуманты.

Жадаючыя паступіць у ВНУ падаюць заяву ў прыймовую камісію ВНУ. У заяве ўказваецца факультэт ці аддзяленьне, на якое падаўшы заяву жадае паступіць. Да заявы прыкладваюцца: дакумант аб узросьце, аб адукацыі, мэдыцынскае пасьведчаньне аб становішчы здароўя, дзьве фотографічныя карткі і анкета. Асобы, якія належаць да працоўнага сялянства, прадстаўляюць пасьведчаньні райвыканкому аб сваім соцыяльным становішчы. Асобы, скончыўшыя рабфакі, накіроўваюць свае дакуманты і анкеты з візай прэзыдыўму адпаведнага рабфаку ў прыймовую камісію ВНУ і мэханічна залічваюцца (бяз колёквіўму і клясавай праверкі) ў лік студэнтаў ВНУ.

Усе асобы, скончыўшыя школы для дарослых узвышанага тыпу, агульна-адукацыйныя курсы, профшколы або 7-гадовыя працоўныя школы і іншыя роўныя ім па курсу навучальныя ўстановы, павінны вытрымаць належныя іспыты ў абхваце курсу рабфаку: па матэматыцы, грамадазнаўству, фізыцы, прыродазнаўству, літаратуры (беларускай і расійскай) і роднай мове (пісьмовая праца).

Увага. Асобы, якія скончылі настаўніцкія сэмінарыі (дарэвалюцыйнага часу) пры паступленьні на Пэдфак пры БДУ трымаюць іспыты толькі па матэматыцы і грамадазнаўству.

Іспыты адбываюцца з 15-га жніўня па 25-е жніўня. Нятрымаўшыя іспыты ў вызначаны тэрмін альбо нявытрымаўшыя іх страчваюць права паступленьня ў ВНУ ў 1927 г., пры чым ніякіх выключэньняў у сэнсе іх умоўнага залічэньня альбо аслабаненьня ад іспытаў ні ў якім разе не дапушчаюцца.

Вольныя месцы ў ВНУ, заставўшыяся незамешчанымі пасьля залічэньня скончыўшых рабфакі, замяшчаюцца на падставе соцыяльнага адбору з ліку вытрымаўшых усе іспыты.

Скончыўшыя тэхнікумы БССР, Вышэйшыя Курсы Беларусазнаўства прымаюцца бяз іспытаў на першы курс ВНУ пасьля 2-гадовага стажу практычнай працы.

Увага. Скончыўшыя Пэдагогічныя Тэхнікумы з 4-гадовым курсам навучаньня прымаюцца пасьля 2-гадовага стажу практычнай працы на другі курс Пэдфаку бяз іспытаў.

Скончыўшыя настаўніцкія інстытуты (дарэвалюцыйнага часу) прымаюцца на другі курс Пэдфаку з іспытам толькі па грамадазнаўству.

Для асоб, скончыўшых тэхнікумы, у выпадку іх службы ў Чырвонай арміі, кожны год прабываньня ў Чырвонай арміі залічваецца за год практычнага стажу.

Залічэньне ў лік студэнтаў ВНУ робіцца Прыймовымі Камісіямі з 25-га жніўня па 1-е верасьня. Адначасова са складаньне мьсьпісаў залічаных у студэнты прыймовая камісія складае сьпіс кандыдатаў.

Пачатак заняткаў 1 верасьня.

У ВНУ павінны паступіць здаровыя людзі.

Да хвароб, перашкаджаючых паступленьню у ВНУ, адносяцца: сухоты, сыфіліс, цяжкія нэрвовыя хваробы, хваробы вокуры і шэраг іншых.

Прыём на Рабфакі.

Прыём ў гэтым годзе адбудзецца на ўсе Рабфакі БССР, апрача Аршанскага. Прыём на Рабфакі праводзіцца Прыймовымі Камісіямі, якія організуюцца пры кожным Рабфаку ў складзе:

дэкана Рабфаку (старшыня); прадстаўніка ЦСПСБ, (альбо АСПС); прадстаўніка АК КП(б)Б; прадстаўніка АК ЛКСМБ прадстаўніка кам'ячэйкі Рабфаку.

Паступаючыя падаюць заявы ў Прыймовую Камісію таго Рабфаку, куды яны камандыраваны. Да заяў далучаюцца наступныя дакуманты (абавязкова ў орыгіналах): камандыроўка адпаведнай організацыі з паказаньнем соцыяльнага становішча паступаючага; пасьведчаньне аб стажы фізычнай працы; пасьведчаньне аб партыйным стажы (для партыйцаў і комсамольцаў); выпіс ад ЗАГС'У аб узросьце; дакумант аб адносінах да вайсковай павіннасьці (для мужчын); спраўка аб становішчы здароўя; асабіста запоўненая анкэта.

Прыём заяў пачынаецца 1-га ліпеня і канчаецца 10-га жніўня. Разгляд заяў Прыймовай Камісіяй і іспыты пачынаюцца 10-га жніўня і заканчваюцца 25-га жніўня.

На рабочыя факультэты прыймаюцца асобы не маладзей 17 і не старэй 28 год:

а) належачыя па свайму паходжаньню да рабочых, або сялян і прапрацаваўшыя ў якасьці наймовых рабочых фізычнай працы ў прамысловасьці, транспарце або сельскай гаспадарцы ня менш 3-х гадоў;

б) земляробы, належачыя па свайму паходжаньню да бяднейшых сялян або рабочых і прапрацаваўшыя ня менш 3-х гадоў земляробам без эксплёатацыі чужой працы.

Увага. Для членаў КПБ і КСМ дапушчаецца паніжэньне стажу фізычнай працы да 2-х год пры 3-х гадох партыйнага стажу.

Рабочым і сялянам, часова парваўшым сувязь з вытворчасьцю, дзякуючы прызыву ў шэрагі Чырвонай Арміі, служба ў астатняй залічваецца як стаж фізычнай працы.

Усе паступаючыя на рабфак праходзяць мэдыцынскі агляд. У выпадку ўстанаўленьня мэдыцынскім аглядам прысутнасьці адной з пералічаных у сьпісе хвароб або калецтва, Камісія ў залічэньні на Рабфак адмаўляе.

Усе паступаючыя на Рабфак праходзяць праверачныя іспыты па арытмэтыцы, беларускай (а на яўрэйскім аддзяленьні Менскага Рабфаку—яўрэйскай і расійскай мове ў абхваце поўнага курсу 4-х груп 7-мігадовай школы і па політграмаце.

Камандыроўкі на Рабфак даюцца па месцу жыцьця паступаючых Акрпрофсоюзам. Асобы, якія належаць да працоўнага сялянства атрымоўваюць камандыроўкі ад Акруговых Аддзелаў Народнае Асьветы (праз Райвыканкомы).

Залічэньне ў лік студэнтаў Рабфаку праводзіцца з 20 па 25 жніўня. Пачатак заняткаў не пазьней 1 верасьня.

Дарослым рабочым не маладзей 23-х год, рабочай моладзі, скончыўшай профшколы, ФЗВ і вячэрнія школы рабочай моладзі, дазваляецца паступіць на 2-гі курс Рабфаку (у Менску і Горках).

Паступаючыя на 2-гі курс Рабфаку праходзяць праверачныя іспыты ў абхваце 1-га курсу Рабфаку. Правы камандыраваньня на старэйшыя курсы рабфаку, маюць толькі Акрпрофбюро.

На вячэрнія Рабфакі прымаюцца толькі рабочыя батракі і бяднейшае сялянства. Камандыроўкі на вячэрнія Рабфакі выдаюцца Акрпрофбюро, ці фаб. зав. мясцкомамі (праз Акрпрофбюро), ці Акр. Аддзел Нар. Асьветы для сялянства.

Правілы прыёму ў Тэхнікумы, профшколы ўсіх тыпаў і Пэдагогічныя Курсы БССР.

Прыём у Тэхнікумы і Профшколы ўсіх тыпаў і на Пэдагогічныя Курсы праводзіцца Прыймовымі Камісіямі, якія організуюцца пры кожным Тэхнікуме, Профшколе ці Пэдагогічных Курсах і працуюць на падставе палажэньня аб іх.

Паступаючыя ў Тэхнікумы, Профшколы ці Пэдагогічныя Курсы падаюць аб гэтым заяву на імя Прыймовай Камісіі тэй навучальнай установы, якую яны абіраюць самі. Да заявы дакладаюцца наступныя дакуманты (абавязкова ў арыгіналах): аб узросьце; аб адносінах да вайсковай павіннасьці (для мужчын прызыўнага ўзросту); аб адукацыі (пасьведчаньне аб сканчэньні навучальнай установы, а для скончыўшых у 1926-27 годзе, апрача гэтага, адозва Пэд. Савету аб акадэмічнай пасьпяховасьці і здольнасьці да паступленьня ў Тэхнікум); мэдыцынскае пасьведчаньне аб тым, што становішча здароўя паступаючага дазваляе працаваць па выбранай спэцыяльнасьці; анкета, завераная партыйнымі, профэсыянальнымі, альбо савецкімі організацыямі ня ніжэй раённага маштабу.

Увага. Для асоб, якія скончылі 7-гадовыя школы пры паступленьні ў Профтэхнічную школу прадстаўленьне адозвы Пэдагогічнага Савету не абавязкова.

Узрост паступаючых у Тэхнікумы павінен быць ня ніжэй поўных 14 і ня вышэй 25-год, у Профшколу—ня ніжэй 14 і ня вышэй 18 год, на Пэдагогічныя Курсы—ня ніжэй 17 і ня вышэй 30 год.

Прыём заяў у Тэхнікумы, Профшколы ці Пэдагогічныя Курсы праводзіцца з 1-га ліпеня па 15-е жніўня.

Усе падаўшыя заявы абавязкова праходзяць мэдыцынскі агляд. У выпадку ўстанаўленьня фізычнай няпрыгоднасьці паступаючага да абранай спэцыяльнасьці, камісія ў залічэньні ў Тэхнікум, Профшколу, або Курсы—адмаўляе.

Увага. У асобных профтэхшколах, апрача мэд. агляду ўстанаўляецца псыхо-тэхнічны адбор, які абавязкова павінен прайсьці паступаючы ў даную школу.

Асобы, якія скончылі ў 1926-27 навучальным годзе поўны курс 7-гадовай працоўнай школы, школы для дарослых узвышанага тыпу і школы сялянскай моладзі пры паступленьні ў Тэхнікумы ўсіх відаў, а таксама на Пэдагогічныя курсы ад іспытаў аслабаняюцца.

Увага 1. Асобы, якія скончылі поўны курс індустрыйных профшкол у 1926-27 годзе, у індустрыйныя тэхнікумы адпаведнай спэцыяльнасьці з школай прымаюцца бяз іспытаў **і ў першую чаргу**; скончыўшыя мэталяапрацовачныя школы у Віцебскі Электра-Мэханічны Тэхнікум, дрэваапрацовачныя і будаўнічыя школы—у Менскі Арх.-Дар.-Буд. Тэхнікум.

Увага 2. Асобы скончыўшыя Смалянскую сельска-гасп. школу прыймаюцца ў сельска-гаспадарчыя тэхнікумы але іспытаў.

Абхват ведаў, неабходных для паступленьня ў профшколы ўстанаўліваецца наступны: для профшкол; **Менскай Аб'яднанай, Менскай—Краўцоў, Віцебскай—Мэталістых, Гарадокскай—Мэталістых, Гомельскай—Мэталістых і Магілеўскай—Мэталістых**— курс 7-гадовай школы: для астатніх індустрыйных профшкол—5 груп 7-гадовай школы; для сельска-гаспадарчых школ—4 групы 7-гадовай школы.

Асобы, якія скончылі поўны курс 7-гадовай школы ў 1925-26 і 1926-27 г. г. пры паступленьні ў профшколу ад іспытаў аслабаняюцца.

У Буда-Кашалеўскую Лясную школу прымаюцца толькі асобы па камандыроўках НКЗему. Тэрмін мэдыцынскага агляду і іспытаў устанаўліваецца паміж 10-га і 20-га жніўня.

Асобы як з ліку аслабаненых ад іспытаў, так і з ліку трымаўшых іспыты, прымаюцца ў лік вучняў на падставе соцыяльнага адбору.

Як паступіць у Магілеўскую (двухгадовую) Савецка-партыйную школу

Мэтаю саўпартшколы зьяўляецца падрыхтоўка партыйца, работніка-масавіка, к організацыі і непасрэднаму правядзеньню політасьветнае працы на вёсцы (загадчык нардому і хаты-чытальні).

Паступаючыя ў саўпартшколы павінны здавальняць наступным умовам:

а) сябры і кандыдаты КПБ і сябры КСМ ва ўзросьце ад 19 да 35 г.; рабочыя і сяляне, працаваўшыя год у хаце-чытальні, праявіўшыя актыўнасьць на партыйнай, комсамольскай, профсаюзнай і савецкай, галоўным чынам політасьветнай працы;

б) мець веды па агульна-адукацыйных прадметах за 4-хгодку, умець чытаць і пісаць пабеларуску і парасейску, а паступаючым на польсэктар — папольску.

Увага. Камандыраваным з Гомельскае і Рэчыцкае акруг запатрабаваньне пісьменнасьці пабеларуску зьяўляецца ўмоўным;

в) маючы агульна-політычную падрыхтоўку ў аб'ёме ня менш, як акапочанай школы політграматы, вясковай школы-перасоўкі альбо школы стацыянаркі і разьбіраючыся ў сучаснай політыцы партыі і савецкае ўлады.

Увага: а) беспартыйныя (не прыналежачыя да КСМ) прымаюцца ў ліку не правышаючым 10 проц. усей лічбы слухачоў школы, і пры тым толькі рабочыя ад станка і сяляне ад сахі, прымаючыя актыўныя ўдзел у грамадзкай працы, непасрэдна высоўваемыя ячэйкамі КПБ і КСМ.

Курсантаў ва ўзросьце да 22 год павінна быць у школе ня больш 35 проц.

У саўпартшколы ня прымаюцца асобны хворыя заразьлівымі хваробамі у тым ліку вэнэрычнымі, туберкулёзам, нэўрастэніяй ў цяжкай форме і не паздараве́ўшыя пасьля цяжкіх хвароб. Інвалідасьць ня можа служыць перашкодаю да паступленьня ў школу, калі яна на заключэньню доктара не перашкаджае разумовай працы.

Дзеля адбору курсантаў у саўпартшколы пры АПА акругкому КПБ утвараюцца камісіі ў складзе: заг. АПА (старшыня), прадстаўніка акрпрафбюро політасьветы і КСМ, жанаддзелу АК, якія сваю працу праводзяць з 1 па 15 жніўня.

Камандыруемыя ў саўпартшколу забясьпечваюцца сродкамі на праезд акрполітасьветамі.

Камандыроўка не гарантуе прыёму ў школу; не залічаныя ў школу звярачваюцца назад на месца сваёй працы, якая за ім захоўваецца.

Члены КПБ з меншым партыйным стажам, кандыдаты КПБ і комсамольцы прымаюцца ў саўпартшколу з такім разьлікам, каб іх агульная колькасьць не перавышала 25 проц. агульнага ліку прымаемых курсантаў. Ня члены КП(б)Б і ЛКСМБ у саўпартшколу II ступені не прымаюцца.

Увага: 1) Камандыраваным з Гомельскае і Рэчыцкае акруг запатрабаваньне пісьменнасьці пабеларуску зьяўляецца ўмоўным.

2) Паступаючыя на яўрэйскае аддзяленьне школы павінны ўмець чытаць і пісаць па яўрэйску і парасейску, альбо пабеларуску.

3) Удзел у грамадзянскай вайне і гады службы ў Чырвонай арміі залічваюцца замест вытворчага стажу.

Адбор курсантаў у саўпартшколы праводзіцца камісіямі, утворанымі пры акругкомах КПБ для камандыраваньня ў Камвуз. Сваю працу камісіі павінны праводзіць з 15 па 31 жніўня.

(Працяг—у чарговым нумары.)

Нівы на балоце.

Асушым балоты—зьнішчым беззямельле.

Першыя працы па асушцы балота.

Ад балота—да добрай глебы.

Балота ў першабытным стане, будзь яно лугавое, пераходнае ці махавое, уяўляе сабою надзвычайна няспрыяючую глебу для вырастаньня культурных расьлін. Вялікая колькасьць вады і недастача неабходных пітацельных сродкаў ствараюць магчымасьць існаваньня толькі балотнай расьліннасьці, якая любіць вільгаць. Культурныя мерапрыемствы, якія вядуць да стварэньня магчымых умоў для гадоўлі кармовых траў на балотных глебах, павінны быць раней за ўсё накіраваны да таго, каб панізіць узровень грунтовых вод і гэтым даць магчымасьць прыступіць да далейшых мерапрыемстваў, якія заключаюцца ў апрацоўцы верхняга пласта і ў папаўненьні глебы недастаючымі пітацельнымі сродкамі.

Асушыцельным працам і далейшай апрацоўцы балотнай глебы павінна папярэджваць самае ўважлівае і ўсебаковае знаёмства з характарам балота. Варта па расьліннасьці ўстанавіць, да якога тыпу балот адносіцца даны культывіруемы вучастак, вызначыць яго месца знаходжаньня, знаходзіцца ён на беразе ракі, возера, ці ляжыць па схілу гары, устанавіць граніцы і ўрэшце, нанесьці яго на карту. **Наступная неабходная задача зьяўляецца нівяліроўка данага балота, каб мець магчымасьць правесьці сетку мэліорацыйных канаў.**

Потым вызначаюць таўшчыню тарфянога пласту, ці магутнасьць культывіруемага балота. Гэта пытаньне важна ня толькі пры правядзеньні мэліорацыйных канаў, але і пры разьвязаньні некаторых практычных пытаньняў, напрыклад, аб магчымасьці распрацоўкі торфу данага балота **для подсьцілкі ці апалу.** Як на папярэднюю працу, што мае вялікае значэньне для характарыстыкі культывіруемага балота, варта зазначыць на **хэмічны аналіз**, які ўтвараецца балотнай станцыяй.

Спосабы асушкі.

Прыступаючы да культуры балот—**яго неабходна асушыць.** Асушэньне балот праводзіцца двуякім чынам. Лішку вады адводзяць шляхам адбудоўкі сеткі адчыненых канаў, ці той-жа мэты дасягаюць наладжваньнем роўнай сыстэмы дрэнажу.

Калі знойдзена месца для адводу вады з балота, зроблена нівяліроўка, можна прыступаць да правядзеньня мэліорацыйных канаў. Пры складаньні сеткі асушыцельных канаў трэба мець на ўвазе, каб вучасткі зямлі паміж канавамі былі па магчымасьці простакутнай формы.

Пры правядзеньні асушыцельнай сеткі раіцца весьці працы наступным парадкам. Зразу праводзяць адводную канаву, а потым бакавыя. **Галоўную канаву** праводзяць па самаму нізкаму месцу. У тых выпадках, калі на даным балоце ёсьць зарослая рака, канаву раіцца весьці па яе руслу, як па лініі найбольшага схілу. Варта зазначыць, што карысна капаць канавы не ў адзін год, а расьцягнуць гэту працу на больш працяжны пэрыод, што дасьць магчымасьць балоту асядаць.

Непасрэдным вынікам асушкі балота зьяўляецца **яго асадка**. Пры складаньні пляну асушкі і пры проэктыраваньні канаў гэтыя абставіны павінны быць прыняты пад увагу. У супрацьлеглым выпадку, пасьля асадкі балота, канавы ці дрэнажныя трубы акажуцца не на патрэбнай глыбіні і мэта асушкі **будзе недасягнутай.**

Роля шлюзаў.


Каб мець магчымасьць у сухі час году падняць узровень грунтоўных вод карыстаюцца наладжваньнем шлюзаў. Шлюзы будуюцца на бакох і на глаўных канаваў. У апошнім выпадку павышаецца ўзровень грунтоўных вод ва ўсіх бакавых канавах, што ўпадаюць у глаўную.

Наогул кажучы, у мэтах экономіі падобныя прылады павінны быць ужыты з такім разьлікам, каб абслужыць магчыма большы вучастак.

Пасьля асушкі балота зьяўляюцца яшчэ далёка непатрэбнай глебай для вырастаньня культурных расьлін; пагэтаму яшчэ прадстаіць цэлы шэраг прац, сярод якіх **ворыва і пляніроўка** займае першае месца. Ворыва з аднаго боку паскарае раскладаньне глебы і тым прыдае верхняму пласту дробна-камкаватую структуру, а таксама зьнішчае першабытныя расьліны.

Г. Пятроўскі.

Менская балотная станцыя.



Магістральная канава.

Балота зямля.

(Малюнак).

— **Вось,** няшчасьця, дык няшчасьця?—бедавалі сяляне вёскі Барсукі, гледзячы на сваё жыцьцё. З трох бакоў гэта вёска абкружана балотам па якім было ні праехаць, ні прайці, ні кароў на яго выгнаць, а нічыпараў конь там утапіўся. Астаўся бядак без каня.

Не бядаваў толькі Шарко Аляксандар. Ён праводзіў сходы моладзі, а потым організаваў ячэйку, якая ўхваліла асушыць 8 гэктараў зямлі, каб паказаць сялянам што і балота—зямля.

Кожную нядзелю і іншыя сьвяты, набраўшы рыдлёўкі ішлі комсамольцы асушаць балота. Кіраваў працаю тэхнік-мэліоратар.

Ну і сьмяяліся з комсамольцаў—дурні вы такія, патопіцеся ў балоце. Цары жылі і зямлі ім хватала, а вам не хапае!

Поп у царквы павёў агітацыю кажучы, што моладзь ведаецца з чортам у балоце, прагнаць іх трэба з вёскі.

Прайшло 6 тыдняў, комсамольцы ня кідалі працы. Моладзь убачыўшы, што па балоце можна хадзіць, як па сухому, пачала дапамагаць у працы, а старыя хоць болей не сьмяяліся, але каб ня здаць сваіх «пазіцый» казалі:—«пагля дзім, пабачым што далей выйдзе».

8 гэктараў асушылі. Трава парасла, сяляне пасьвілі тут коняй.

* * *

Вечарам быў сход комсамольскай ячэйкі. Прышлі пажылыя сяляне.

Шарко зрабіў даклад—«што мы зрабілі па асушцы балот і што павінны яшчэ зрабіць».

Сяляне выступаюць:—мы таксама будзем канцамоламі», будзем працаваць. А дзед Мірон з вугла крычыць—«зямлю», пляц асушаны назваць імям Комсамолу»

На папа цяпер кажуць:—ты вось і з богам ведаешся, але нічым нам не дапамог, пры табе яшчэ сто гадоў жылі-б у балоце, сабірай свае манаткі і ўбірайся... болей слухаць ня будзем!..

На ранейшым балоце такое жыта красуецца—радасьць бярэ.

Міхась Марковіч.



Туды, дзе чыстая паветра.



Як менскія піонэры рыхтуюцца да лягераў.

Слова за іншымі піонэрорганізацыямі.

Туды, дзе паветра чыстае.

Добрая справа—лягеры. Калі не скарыстаць лета ў лягерох, не скарыстаць сонца, чыстае паветра і ваду,—гэта адзначае **застацца хворым, хілым, нікуды ня годным.**

Прымаючы гэта пад увагу, райдзетбюро Менскага Горраёну шчыра ўзялося за падрыхтоўку да лягернай кампаніі.

Сродкі—даставалі па рознаму: у заўкомаў, з пастановак у клюбах, праз зборы грошай з бацькоў піонэраў.

Горш за ўсё справу мець в фабкомамі.

— **«У нас сталая сьмета, ня маем магчымасьці перавадзіць з іншых літараў»**—вось звычайны адказ на піонэрскія сьлёзы.

Напрыклад, старшыня заўкому скурнікаў, дык вось як адказаў:

— **Мы вам даем 6 рублёў у месяц і больш... я вас зусім ня ведаю!**

Зусім іншая справа з бацькамі.

На бацькаўскім сходзе Меншвэй, выказалась 9 бацькоў. Вось іх словы: **«Дзеля здароўя піонэраў—лягеры неабходны».** А вось іх прапановы: 1) **Лягеры будаваць блізка каля вёскі, каб піонэры маглі начаваць у школе.** 2) **У лягеры ўзяць 2-х—3-х матак.** 3) **Вылучыць камісію каб зьбірала грошы з бацькоў піонэраў.**

Некаторыя атрады ўсю зіму зьбіралі грошы на лягеры. Напрыклад, атрад другароў мае «зімніх грошай» каля 60 рублёў.

У гэтым годзе мы будзем ствараць тыпавыя лягеры г. з. што некалькі атрадаў аднаго саюзу выйдуць разам у лягер.

Іоха.

Вясна, як многа ў гэтым гуку для сэрца піонэрскага зьлілося!..

(Менск, Ляхаўскі раён).

У гэтым годзе райбюро ЮП прыняла меры к таму, каб у лягеры змаглі высьціня толькі асобныя матар'яльна-забясьпечаныя атрады, **а 60-70 проц. усёй організацыі.**

Дзеля гэтай мэты Ляхаўская райпіонэрорганізацыя **падзелена на 6 груп, па 4 атрады ў кожнай.** У кожнай групе маюцца два атрады матар'яльна больш забясьпечаныя і два менш, каб першыя дапамагалі другім. Лягерны фонд кожнай групы ўтвараецца агульнымі сіламі ўсіх уваходзячых у яе атрадаў.

Кожны атрад і група цалкам склікаюць сходы бацькоў, дзе ставіцца пытаньне аб задачах лягернай кампаніі і дапамозе ёй. Бацькі ахвотна адгукаюцца на дапамогу лягерам; напрыклад, на заводзе «Чырвоная Зара» бацькі піонэраў адлічылі ў лягерны фонд па паўтары руб. кожны.

Акрамя агітацыі бацькоў якая, як мы ўжо бачылі, не застаецца бяз вынікаў, некаторыя атрады наладзілі атрадную «капілку», куды кожны піонэр дае колькі можа ў карысьць лягеру.

Вытворчыя атрады пусьцілі сярод дарослых рабочых, партыйцаў і комсамольцаў падпісныя лісты, якія таксама далі некаторую суму грошай. Сродкі атрымліваемыя ад шэфаў штомесячна, не трацяцца зараз, а ідуць у лягерны фонд.

Вясна, як многа ў гэтым гуку для сэрца піонэрскага зьлілося!

Пасьля лягеру—гір не хапае



Аб лягерных кухарох.

(У парадку абгаварэньня).

Нельга даручаць гаспадарку поўнасьцю на піонэраў, альбо павадыра. Час праведзены ў лягеры трэба перш за ўсё скарыстаць для аздараўленьня. А весьці лягерную гаспадарку займае амаль што ўвесь дзень. Акрамя гэтага, ад падобнай «гаспадарнасьці» ці будзе якая небудзь карысьць? Тут трэба паставіць вялікі пытальнік.

Весьці гаспадарку ў лягеры павінен чалавек маючы ў гэтым пытаньні якія небудзь веды.

Таксама і з іншым важным пытаньнем—шамоўкай. Калі пакласьці падрыхтоўку харчаваньня на піонэраў—будзе, вядома, недарэчнасьць. Аб гэтым гавораць мінулыя «лягерныя часы». Паміж тым самы галоўны фактар аздараўленьня—шамоўка напэўна будзе з рук вон дрэнны. Ці «перажарацць», ці недаварацць.

І тут патрэбен спэцыяльны чалавек.

Доктара цяжка прыцягнуць у асобныя лягеры, а вось мэдыцынскую сястру прыцягнуць куды лягчэй. Такая сястра будзе адначасова і загадчыцай гаспадаркай.

Самыя галоўныя пункты лягераў: гаспадарка, шамоўка і аздараўленьне будуць забясьпечаны. **Доктар Спаскі.**

Як кіно будуе лягеры.

(Атрад прац. мастацтва).

Тры гады існуе наш атрад. Тры гады мараць піонэры аб лягеру. Але гэта былі ўсе мары. Зараз гэтае пытаньне вырашана канчаткова. Бюро парт'ячэйкі заслухаўшы інформацыю комсамольскай ячэйкі, ухваліла: **Утварыць некалькі кіно-сэансаў** у дзень адпачынку (панядзелак) і ўсе грошы аддаць на лягер для піонэраў. Гэтыя кіно-сэансы дадуць нам 200 ці 300 рублёў.

Больш грошай мы яшчэ думаем сабраць праз бацькоў, саюз і г. д.

Лягер мы зробім каля лягеру сатаварыскага нам эскадрону. Будзем такім чынам **трымаць цесную сувязь з чырвонай арміяй.**

Піонэры вельмі здаволены тым, што ідуць у лягеры.

Трэба адзначыць, што партыйная ячэйка першая прышла на дапамогу піонэратраду ў гэтай справе. **Блакітны.**

Я. Жук.

Па Волзе.

(3 натуры).

Гарачы ліпнёвы дзень.

Сонца стаяла ў зеніце і пякло неміласэрдна. Было горача: здавалася нібы знаходзішся ў лазьні, на верхняй полцы, дзе ад гарачае пары робіцца млосна, а тут яна з кожнай хвілінай усё прыбывае і прыбывае... Жартаўнік вецер, як бы ў чароўным сьне—і той прыціх. Нават рэчка цякла цішэй, сонячныя праменьні ў ёй праламляліся, тысячамі дыямэнтаў адбівалі на паверхні вады, надавалі ёй выгляд расплаўленае масы шкла і зьнікалі ў вадзяным бяздоньні. Цішыня панавала навокал.

У такую сьпякоту параходы па Волзе поўны падарожнікаў. Якіх толькі людзей ня сустрэнеш тут: татары з медзянымі тварамі і выпучанымі скуламі, у доўгіх балахонах, армяне, тыповыя расійскія сяляне і, нават, сустракаюцца шчасьліўцы беларусы. Кожны едзе па сваіх справах, а хто дык і бяз спраў, а так проста праехаць па «матушцы»—Волзе», падыхаць сьвежым паветрам і падзівіцца хараством прыроды.

Вось і прыстань. Тры званкі раптам прарэзалі паветра, у адказ адгукнуўся працяжны зычны гудок, пачулася далёкае рэха і параход паступова пачаў адыходзіць. З кожнай хвілінай, прытка падаваўся параход наперад, меншымі станавіліся будынкі, бераг, людзі, якія стоячы на беразе, шапкамі і хусткамі махалі і, нарэшце, зусім усё зьлілося ў адну шэразялёную масу.

А наперадзе новыя малюнкі, прыгажосьці.

Даль раступаецца.

Наабапал Волгі ляжаць прыгожыя берагі зарослыя лесам і кустамі, якія то падымаюцца высока, то раптам сыходзяць у нізіну, лес і кусты зьнікаюць, а іх месца займае жоўты, пясок.

О, гэты пясок не падобен нашаму жвіру! Цяжка падабраць такое дробнае сіта, каб прасеяўшы на яго атрымаць пясок падобны гэтаму. На працягу сотняў год, пад уплывам ветру і вады ўтвараўся ён...

Часамі сустрэнецца вёска раскінутая ў самага берагу... Далёка ад неба відаць жоўтыя прасьціралы збожжа... Людзі рэдка сустракаюцца. Ціха і горача на зямлі, на сіняй муці неба—распаленае сонца...

А тут блізка пад нагамі злосна бурчыць вада і срэбрам пераліваецца пад сонечнымі праменьнямі.

Усё акаляючае такое простае, урачыстае і спакойнае. Глядзіш на паступовыя зьмены горнага берагу, на неабдымную шырыню сенажацяй, на сіні лес, атулены імглою—яны падыходзяць да вады і зазірнуўшы ў люстру яе—зноў зьнікаюць ад чалавечага вока.

Уся істота зьліваецца з акаляючым хараством прыроды, глядзіш і здаецца няма на сьвеце болей такіх простых і разам з тым прыгожых месц, якімі зьяўляюцца вось гэтыя ціхія берагі рэчкі.

На колькі бачыць чалавечае вока, відна вада, берагі, лес, пясок ды часамі бліснe вузенькая істужка рэчкі...

Як хораша ўсё гэта сагрэтае ласкамі сонца разаслаўшым залатыя валасы па ціхай, адбіваючай неба вадзе. Вада цячэ на зямлі, як цячэ само жыцьцё. Вось здаецца хоча яна расказаць, што бачыла на сваім жыцьці; расказаць пра Сьценьку Разіна, якога насіла на сваіх плячох, але раптам забурчыць, захвалюецца, блісьне на сонцы—і пашла далей. Едзеш па ёй, з кожным крокам новыя малюнкі, прыгажосьці.

Канца вады ня відаць...

Курсы піонэрпрацаўнікоў.

10-га чэрвеня пачынаюць працаваць усебеларускія курсы старшынь вясковых райбюро ЮП, разьлічаныя на 50 чалавек. Тэрмін заняткаў на курсах—месячны.

Разьверстка на курсы наступная: Менскаму, Віцебскаму, Барысаўскаму, Бабруйскаму і Мазырскаму акругкомам па 5 месц. Магілеўскаму, Калінінскаму і Полацкаму АК—па 4 месцы. Гомельскаму, Рэчыцкаму і Слуцкаму АК па 3 месцы.

Кончыў школу, а далей?..

Аб чым кажа новая дырэктыва.

Галоўпрофасьветы сумесна з ВСНГ **вызначыў новы парадак правядзеньня выпуску з школ ФЗВ.**

У гэтым годзе застаўленьне вучняў у апошняй клясе ФЗВ на другі год будзе рабіцца толькі ў выключных выпадках, калі вучань адстаў па прычыне не залежачай ад яго, як хвароба і інш.

Вучням, слаба скончыўшым школу, як па тэорэтычнай, так і па практычнай частцы, выдаюцца толькі пасьведчаньні аб праслухоўваньні курсу школы.

Для правядзеньня выпуску ўтвараецца камісія ў складзе: загадчыка школы, інструктара, настаўніка, прадстаўнікоў вучкому і ячэйкі ЛКСМБ.

Перапынак у занятках школ ФЗВ адбудзецца з 1-га чэрвеня па 1-е верасьня, прычым ад 15-га мая па 1-е чэрвеня адбываецца падагульненьне пасьпяховасьці вучняў і працы школы за год.

Па лініі ВСНГ **дадзена дырэктыва трэстам аб неабходнасьці разьмеркаваньня выпускнікоў школ ФЗВ на працу.**

Курсы па падрыхтоўцы ў ВНУ.

У Менску пры Акрана адчыняюцца каротка-тэрміновыя курсы па падрыхтоўцы ў ВНУ.

На курсы прымаюцца без колёквіўму скончыўшыя агульна-адукацыйныя курсы, вячэрнія школы павышанага тыпу і школы 2-й ступені; па колёквіўму: скончыўшыя сямігодкі і школы моладзі павышанага тыпу.

Прыём заяў і выдача справак у намяшканьні 9-й школы, Міхайлаўская, 4, 4-ты паверх, з 16-га па 20 мая ўключна з 11 гадзін да 2 і з 6 да 8 гадзін вечару штодзённа.

Курсы будуць існаваць на самааплаце. Плата за навучаньне будзе вылічацца выходзячы з заробку. **Таварышы, якія атрымоўваюць менш 20 рублёў пэнсіі і беспрацоўныя, аслабаняюцца ад платы шляхам падачы заяў у прыймовую камісію курсаў. Асобы, якія ня маюць магчымасьці плаціць і не адносяцца да вышэй паказаных груп, зварачваюцца ў свой профсаюз з просьбай, каб саюз за іх плаціў.** У выпадку згоды на гэта саюзу, грошы трэба атрымаць на рукі і ўнесьці належную плату.

Курсы будуць існаваць 3 месяцы. Пры сканчэньні будуць выдавацца спэцыяльныя пасьведчаньні.

У прыймовую камісію курсаў уваходзіць прадстаўнік Менакругкому ЛКСМБ.

* * *

Таксама ў **Менску організуюцца каротка-тэрміновыя курсы па падрыхтоўцы на рабфак.** Прыём на гэтыя курсы будзе адбывацца па камандыроўкам ЦП адпаведных саюзаў.

У беспрацоўных

— За красавік месяц юнсэкцыя паслала 65 чалавек на грамадзкія работы, звыш броні 2 чал., у ліку броні 15 чал. і 10 чал. па дабраахвотнаму спросу. Такім чынам усяго паслана за красавік 96 чал.

За красавік месяц колькасьць беспрацоўных падросткаў зарэгістраваных у юнсэкцыі ўзрасла на 56 чал.

Трайное сьвята.

Аб баўгарскай мове і адным юбілеі

На вечары друку ў клюбе імя Карла Маркса.

Гэта ня быў казённы, афіцыйны вечар. Гэта быў хутчэй вечар спайкі паміж прысутнымі рабкорамі, юнкорамі, насьценкорамі і працаўнікамі друку.

Праз усю сцэну цягнецца шырокі аншлаг **«Савецкая Беларусь» № 2000.** Прадстаўнік юбіляра, рэдактар **«Савецкай Беларусі»** тав. **Кудзелька** сядзіць у прэзыдыўме з таварышамі **Жылуновічам, Шульманам, Гэршонам, Ашаровічам і інш.**

Вечар ад імя Акругкому партыі адчыняе тав. **Гэршон** і дае слова для дакладу загадчыку аддзелам друку ЦК КПБ тав. **Сенькевічу.**

— Сягоньня, кажа дакладчык, мы справуляем трайное сьвята **15—годзьдзе «Праўды», выхад 2000 нумару «Савецкай Беларусі» і нарэшце адчыненьне менскай агульна-гарадзкой выстаўкі насьценных газэт.**

«Праўда», чый 15—гадовы юбілей мы зараз адзначаем, адыграла вялізарную ролю ў гісторыі нашай партыі. Яна групавала навакол сябе рабочыя масы, заклікала да барацьбы з буржуазіяй і нарэшце прывяла да перамогі ў Кастрычніку 1917 г.

— Пасьля Кастрычніка **«Праўда»** прадаўжае заставацца выявіцелем думак і настрояў рабочае клясы, яе рупорам, да якога прыслухоўваюцца ўсе працоўныя.

Коратка абмаляваўшы этапы **«Праўды»**, тав. Сенькевіч пазнаёміў прысутных са становішчам нашага беларускага друку:

— Мы маем 21 газэту з агульным тыражом звыш 90 тысяч і 15 часопісаў па самым розным галінам—літаратуры, політыкі, сельскай гаспадаркі, асьветы і г. д. Усе гэтыя выданьні групуюць навакол сябе вялізную армію корэспондэнтаў у **4500 чалавек.**

— Што ўяўляў сабой беларускі друк у дарэволюцыйны час? Калі трэба было выдаць нам беларускую кнігу, дык мы прасілі цэнзара аб дазволе надрукаваць кніжку на... баўгарскай мове. Гэта баўгарская мова, зразумела, была «дутая». Але характэрна, што нават баўгарская мова карысталася большай пашанай з боку царскіх зубраў, чым мова, на якой гаворыць мясцовае насельніцтва. Тыя нешматлікія беларускія газэты, якія існавалі ў нас кароткі час да рэволюцыі (**«Наша Ніва»**), прасьледваліся царскім урадам за тое, што гаварылі масам праўду.

Тое самае мы назіраем зараз і ў Заходняй Беларусі, дзе польскі ўрад, прасьледваючы «бальшавіцкую заразу», не дазваляе існаваць і разьвівацца беларускаму пэрыодычнаму друку. Польскі ўрад зачыняе існуючыя газэты, арыштоўвае і судзіць іх рэдактароў, супрацоўнікаў і нават чытачоў.

Дакладчык закончыў сваю прамову віншаваньнем юбіляру—газэце **„Савецкая Беларусь“**. Урачыстая частка вечару закончылася інформацыяй тав. **Дунца** аб адчыненьні агульна-гарадзкой выстаўкі насьценных газэт.

Вялікім посьпехам карысталася выступленьне маладнякоўцаў **Дудара, Александровіча, Вольнага, яўрэйскага поэта М. Тэйфа і нарэшце расійскага поэта С. Кірсанава.**

Язэп.

Друкаванага слова парад

(Карнавал, прысьвечаны Дню Друку).

Парад... Але замест вінтовак у руках вострыя двухмэтравыя алоўкі, замест сьцягаў—велічэзныя кніжныя вокладкі, загалоўкі газэт і часопісаў...

Вось крочаць у шэрых вясковых сьвітках і лапцёх селькоры «Беларускай Вёскі». У першым шэрагу — самы маленькі селькор газэты Грышка Бачыла. Ён стараецца ісьці ў ногу з старэйшымі таварышамі, але гэта не ўдаецца і тады Грышка пушчаецца ўдагонку...

Зразумела, тут прысутнічае і фанэрны бюрократ, наскрозь праколаты бліскучым пяром рабкора... Здаецца, ён, гэты бюрократ, п а в і н е н быць ужо мяртвы, але не, хітрая ўхмылка гнязьдзіцца ў яго намаляваных вуснах: «а ўсё-ж такі я жывы!».

«Чырвоназьменаўцы» дэманструюць дасягненьні газэты: організацыя масавага турызму, конфэрэнцыі маладых гаспадароў, нарады замужных комсамолак, паход моладзі ў тэатр і інш.

«Юнгэрарбэйтэрцы» займаюцца вельмі практычнай справай: прадаюць сваю газэтку.

Рэдактар шчасьлівы: ён прадаў усе нумары...

Бойка выкрыкваючы колектыўныя лёзунгі, адбіваюць такт піонэры.

Весела. Вясеньні настрой. Песьні.

Прыбраўшыся ў картонныя шчыты, на якіх намаляваны назвы розных кніжак, праходзяць супрацоўнікі Белдзяржвыдавецтва.

— **Дарогу—кнізе**—раздаецца з над шчытоў...—**дарогу...**

У самым канцу калёны ідуць «нячытаючыя газэт». Яны—злыя. Яны ня могуць выконваць свае ролі. І на самай справе—як гэта крычаць, што я ня чытаю газэты, калі гэта няпраўда! І фальшыва гучыць:

— «Ня трэба чытаць газэты... У іх нічога няма добрага»...

Карнавал праходзіць міма акругкому партыі. Кароткія прывітаньні:

— **У Дзень Друку — бліжэй да друку!**

— **Пішы і чытай газэту!**

— **Узмацняй комсамольскі друк!**

На Пляцы Волі з бальконў Саўнаркому дэманстрантаў вітаюць старыя газэтныя працаўнікі. І зьнізу нясецца адказ:

— **Моладзь вітае Ленінскую «Праўду»!**

— **Няхай жыве комуністычны друк!**

— **Няхай жыве КП(б)Б!**

«Нячытаючыя газэт» урэшце ня вытрымалі і таксама крычаць:

— **Пашырай падпіску на газэты!**

Карнавал, організаваны па ініцыятыве горрайкому комсамолу, прашоў **удала.**

Г.

На бяспрытульнасьць!

(Гутарка з старшынёй дзеткамісіі пры ЦВК А. Таўбэ).

Адным з асноўных лёзунгаў сёлетняга міжнароднага дзіцячага тыдню—павінна быць **узмацненьне барацьбы з бяспрытульнасьцю.**

У сілу цэлага шэрагу прычын эканамічнага характару, дзіцячая бяспрытульнасьць на абшарах Беларусі больш разьвіта, чым на якой небудзь мясцовасьці СССР роўнай з намі тэрыторыі. **Зразумела, што і барацьба з гэтай бяспрытульнасьцю ў нас павінна быць больш інтэнсыўнай.**

Трэба раз назаўсёды адмовіцца ад таго погляду, быццам ліквідацыя бяспрытульнасьці залежыць выключна ад дзяржавы. **Барацьба з гэтым злом ня ў меншай меры залежыць ад ініцыятывы і дапамогі самых шырокіх колаў грамадзкасьці, у прыватнасьці Комсамолу і піонэраў.**

Ці ўдзельнічае Комсамол у справе барацьбы з бяспрытульнасьцю? У некаторых акругах удзельнічае. Напрыклад, у Віцебску комсамольцы трымаюць самую цесную сувязь з дзеткамісіяй Акрана і працуюць па яе заданьням: выяўляюць бяспрытульных, прымацоўваюць іх да атрадаў і г. д.

Па ініцыятыве і бліжэйшай дапамозе комсамольскіх органаў, у **Віцебску організаван клюб-сталоўка для бяспрытульных, дзе комсамольцы праводзяць значную культурную і выхаваўчую работу.**

Аналёгічныя факты ў **Магілеве і Барысаве**, дзе комсамольцы таксама лічаць барацьбу з бяспрытульнасьцю сваёй бліжэйшай задачай і па меры магчымасьці яе падтрымліваюць.

Як-жа абстаіць гэта справа ў астатніх акруговых гарадох БССР, у тым ліку і ў Менску?

На вялікі жаль трэба адзначыць, што тут комсамольцы яшчэ не раскачаліся ў параўнаньні хаця-б з Віцебскам, і нічым сябе не праяўляюць на ніве барацьбы з бяспрытульнасьцю.

Міжнародны дзіцячы тыдзень павінен даць штуршок гэтай справе, палажыць пачатак сыстэматычнаму і плянамернаму ўдзелу комсамольскіх організацый у ліквідацыі бяспрытульнасьці.

У чым практычна можа выявіцца гэты ўдзел? Тут працы непачаты кут. Перш за ўсё акругкомам ЛКСМБ належыць зьвязацца з дзеткамісіямі, каб усю работу праводзіць у цесным кантакце з імі. Весьці агітацыю за распаўсюджваньне сярод моладзі і дарослых лётарэйных білетаў у карысьць бяспрытульных. Організаваць ячэйкі «Прыхільнік дзяцей», там дзе іх няма, і ўцягваць у таварыства «ПД» новых членаў. Дапамагаць дзеткамісіям шляхам выяўленьня бяспрытульных, высьвятляць ступень патрэбы іх і г. д.

Па прыкладу Віцебску проэктыруецца організацыя клюбу-сталоўкі для бяспрытульных у Менску. Тут неабходна дапамога комсамольскай організацыі.

А піонэрскія організацыі? І для іх знойдзецца работа па сілам: прываблененьне бяспрытульных да атрадаў і ўцягненьне іх ў шэрагі піонэраў, колектыўныя ўступленьні ў таварыства «Прыхільнік дзяцей», нарэшце дапамога Комсамолу ў выкананьні вышэй пастаўленых перад ім задач...

Удзел у барацьбе з дзіцячай бяспрытульнасьцю павінен разглядацца комсамольскімі організацыямі, як адна з першачарговых і неадкладных задач.

Масавы шахтурнір набліжаецца да канца.

Турнір пераможнікаў.

Вячэрнія групы турніру пераможнікаў іграюць апошні тур, які вылучыць удзельнікаў фінальнага турніру.

У ранішніх групах гульня ўжо скончылася.

Вынікі гульні ў групах.

У 1-й групе на першае і другое месцы вышлі **Мазель і Лейкінд.**
У 2-й групе—**Будоль, Івянскі, Шусэр і Татур.**
У 3-й групе—**Штэйн.**
У 4-й групе ўперадзе ідуць—**Дакшыцкі А. і Вакштэйн.**
У 5-й групе—**Хігэровіч, Шэвельман і Кобац.**
У 6-й групе—**Войтак і Іваноў.**
У 7-й групе—**Кацнельсон і Аўраменка.**
У 8-й групе—**Мазелеў.**
У 9-й групе—**Ліўшыц і Скаўскі.**
У 10-й групе—**Гардон і Розэнблюм С.**

Клімаўцы на сьцэне БДТ.

(Выступленьне на тэатральным дыспуце).

Нешта новае, бадзёрае, захапляючае ўсіх прысутных паказалі сваімі выступленьнямі КІМаўцы...

Іх выступленьні лепш за ўсё гаварылі пра тую ўпартую працу, якая праводзіцца ў клюбе «КІМ». Паступова, але па правільнаму шляху рухаецца ўперад клюб... «КІМ» расьце...

Цёпла сустрэла Менская моладзь, напоўніўшая Белдзяржтэатр, КІМаўцаў...

«Вэнгерскія скокі», удала выкананыя, затым плястычныя «дзікія скокі» з факеламі, акрабатычныя нумары спортсмэнаў (трыо), оркэстр духавой музыкі—усё гэта было прасякнута выключна чымсьці юнацкім маладым...

Моладзь апледыравала... Моладзь была ў захапленьні...

Большасьць прысутных ужо бачыла гэтыя нумары. Але яны ім ніколі не надаедаюць... Яны-б бесперапынна слухалі іх. Прытым-жа, дзякуючы паслугам упартага ў сваёй працы тав. Алексютовіча, жадаўшага, як-бы там ня было, паставіць працу балетнага гуртка на «ять», кожнае новае балетнае выступленьне мае ўжо нешта новае.

КІМаўцы—малайцы! Яны праводзяць сапраўдную мастацкую працу. **Р. Г—н.**

Каго выпушчае ЦІП.

Апошні выпуск курсаў Цэнтральнага Інстытуту Працы даў шмат сьвежай, кваліфікаванай сілы.

Па сьлясарнаму цэху скончылі курсы 75 чалавек, з якіх 7 па 3-му разраду, 4 на 4-му, 29 на 5-му, 26 па 6-му і 5 на 7-му.

Па кавальнаму цэху выпушчана 2 чалавекі па 3-му разраду, 9 на 4-му, 23 на 5-му 18 на 6-му і 5 на 7-му. У ліку скончыўшых курсы—60 проц. моладзі.

Гэтымі днямі на курсах зноў пачаліся заняткі.

Сярод слухачоў 36 комсамольцаў.

Мэдыцынская консультацыя *)

(Адказы проф. Кроля)

Запытаньне № 1 (П. Алфеева). Як вылячыцца ад заіканьня?

Адказ. Заіканьне, як правіла, праходзіць з гадамі без усякага лячэньня. Часьцей усяго ў аснове яго ляжыць надта вялікая ўзбуджальнасьць нэрвовай сыстэмы. Пагэтаму заіканьне звычайна наступае тады, калі чалавек хвалюецца. Лепшы мэтад лячэньня заіканьня—гэта ўзмацненьне нэрваў абціраньнямі, фізычнай культурай, рэгуляваньнем рабочага дню: класьціся спаць не пазьней 11 гадзін, нармальна есьці, не курыць і не піць, бываць на паветры.

Карысна ў працягу 1—2 тыдняў зусім не гаварыць і за гэты час узмацніць вышэйпаказаным шляхам нэрвовую сыстэму.

Па меры ўзмацненьня нэрваў, павялічыцца вера ў свае сілы і разам з гэтым пройдзе і заіканьне.

З кніг на гэтаму пытаньню рэкомэндую прачытаць кнігу Неткачова „Заіканьне“.

Запытаньне № 2 (Дзьвігацеля). Які ўплыў аказвае на чалавека ананізм і як ад яго пазбавіцца?

Адказ. Ананізм, як і ўсякае іншае палавое ліішнітва, надта зморвае організм наогул, а нэрвовую сыстэму ў асаблівасьці.

Калі кінуць ананізм, організм можа зноў добра аднавіцца.

Людзі, схільныя да заняткаў ананізмам, павінны ўзмацняць свае нэрвы халоднымі абціраньнямі, спортам, у належны час класьціся спаць, набольш праветрываць кватэру і займацца сыстэматычна якой небудзь працай—фізычнай ці разумовай, якая-б іх адцягвала ад эротычных думак і стварыла-б для іх іншыя інтарэсы. Ананізм кінуць лёгка, калі толькі чалавек настолькі сьвядомы, што разумее яго шкоду.

*) „Мэдыцынская консультацыя“ будзе зьмяшчацца ў „Чырвонай Зьмене“ пэрыодычна. Запытаньні трэба прысылаць на адрасу рэдакцыі з паметкай: „У мэдыцынскую консультацыю“.

Папраўка.

У мінулым нумары нашай газэты па недагляду начнога рэдактара ўкралася досадная памылка: на 2-ой старонцы, у аддзеле „Паветра—вада—сонца“ у прамову тав. Серафімава ўстаўлена частка дакладу тав. Хейфеца, а іменна, пачынаючы з абзацa „Толькі 2...“ і да абзацу „Турызму“...

Рэдакцыяй ужыты захады да непаўтарэньня падобных недапусьцімых памылак у далейшым.

Пакойчык 50-ці краін.

Я ў Менскім бюро міжнароднай рабочай сувязі.

Прад вачыма бялюткі кавалак паперы, сьпісаны дробнымі роўнымі літарамі. Гэта ліст з далёкай Юга-Славіі, з гораду Спліт ад **Міла Клем.**

Міла Клем піша суха і проста. Ён ня скардзіцца, ня плача, а толькі прыводзіць калёнкі лічбаў... І лічбы кажуць лепш усякіх слоў!

Юга-слаўскі рабочы-падростак зарабляе ў сярэднім **25 дзінараў у месяц (а кіле хлеба каштуе 5 дзінараў).** Тлумачэньні тут не патрэбны...

У Юга-Славіі існуе страшэнная эксплёатацыя працы дзяцей і падросткаў. Рабочы дзень для моладзі цягнецца **12—16 гадзін.**

Добра, каб хоць яшчэ за гэту цяжкую працу зараз-жа давалі грошы! Але на юга-слаўскіх фабрыках уведзен такі парадак, што падростак раней павінен 3-4 гады папрацаваць дармова і толькі тады атрымоўвае права на жалкую пэнсію ў 25 дзінараў...

... Звычайнае і «нормальнае» зьявішча, калі майстар зьбівае падростка... **Б'юць калі ахвота і ніхто гэтаму ня супярэчыць!..** Ня дзіўна, што ў Юга-Славіі за апошнія часы сталі частымі выпадкі самазабойства сярод рабочай моладзі—атрута ці вяроўка ўжо лепш, чым такое жыцьцё...

Але **Міла Клем** ня падае духам! Яго лепшая апора—весткі ад нас...

І ня адна Юга-Славія...

Кожны тыдзень менскія эспэрантыстыя атрымоўваюць усё новыя лісты з Нямеччыны, Баўгарыі, Афрыкі, далёкай Інданэзіі, Аўстраліі і іншых краін... З усёй зямной кулі зьлятаюцца сюды, у гэты маленькі пакойчык, весткі аб жыцьці нашых рознаколерных братоў, весткі, палаючыя надзеяй на лепшую долю...

Цікавы ліст прыслаў Бурт Фрыдрых з Лютэнбэргу (Баварыя). У сваім лісьце ён апавядае аб пастырах, якія прыдумалі новую махінацыю, каб набіць свае кішэні. Яны прад'явілі ў парлямант іск, каб іх даходы лічылі па 1924 году, калі продукты сельскай гаспадаркі былі самыя танныя.

З тэй прычыны, што амаль усе пастыры зьяўляюцца абшарнікамі, а даходы з маёнткаў прымаюцца пад увагу пры выдачы ім дзяржаўнай пэнсіі, яны і хочуць тук як небудзь выкруціцца... А ўсё гэта кладзецца цяжарам на плечы працоўных мас... Навокал—міліёны беспрацоўных, інвалідаў вайны, сірот і г. д., а баварскі парлямант мусіць здаволіць прэтэнзіі «сьвятых айцоў»...

... Вось ліст ад Хоза Пірэса—корэспондэнта паўднёва-амэрыканскіх прэрый... Ліст ад селькора Гарсмана з вёскі Адальмээр (Галяндыя)... Ад грузчыка фабрычнага Эссэна Густава Нэймана, ад Франца Пэрха з Фінляндыі, ад... Разі можна ўсіх пералічыць?...

У агульным менскае бюро міжнароднай сувязі вядзе перапіску **з 50 краінамі.**

Большасьць прысылаемых лістоў друкуецца ў газэтах Беларусі, астатнія—у насьценгазэце клюбу імя Карла Маркса.

У сваю чаргу адказныя допісы нашых рабкораў і селькораў таксама ахвотна друкуюцца ўва ўсіх чужаземных рабочых газэтах. Адна корэспондэнцыя бабруйскага селькора пад назвай «Як мы будуем соцыялізм» абышла ўсе эўропейскія газэты!

Якую вялікую радасьць адчуваеш, калі прагавітымі вачыма прабягаеш радкі ад далёкага чужаземнага таварыша! І як досадна на тое, што сярод нашых комсамольцаў да гэтай пары так мала [illegible]...

Алесь Каліта.

Адказныя рэдактары { А. БАРАНЬНІКАЎ. А. КУРЦІК.

Галоўлітбел № 24867. Менск, 2 друкарня БДВ.